**Білет 1**

**Практычнае заданне.**
**Станаўленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Што такое дзяржаўны суверэнітэт?
2. Пацвердзіце цытатай сцвярджэнне: «У Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь адлюстраваны прынцып суверэнітэту беларускай дзяржавы».
3. Якія духоўныя каштоўнасці беларускага народа знайшлі адлюстраванне ў Дзяржаўным гімне Рэспублікі Беларусь?
4. Складзіце схему «Органы дзяржаўнай улады ў Рэспубліцы Беларусь», адлюструйце ў ёй прынцып раздзялення ўлад.

**I. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР і наданне ёй статусу канстытуцыйнага закона** (*па матэрыялах вучэбнага дапаможніка " Гісторыя Беларусі. 1917 г. - пачатак XXI ст.9 клас*»).

У другой палове 1980-х гг. працэс перабудовы прывёў да ўзнікнення і развіцця ў СССР нацыянальных рухаў. Рэспублікі Савецкага Саюза абвяшчаліся раўнапраўнымі і незалежнымі. Паступовае паслабленне саюзнай улады абумовіла выспяванне ідэі дзяржаўнага суверэнітэту. Ён прадугледжвае палітычную незалежнасць і самастойнасць дзяржавы ва ўнутранай і знешняй палітыцы, якая не дапускае ўмяшання звонку.

27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. У ёй БССР абвяшчалася суверэннай дзяржавай.

Пасля жнівеньскіх падзей 1991 г. працэс афармлення суверэнітэту Рэспублікі значна паскорыўся. 25 жніўня 1991 г. быў прыняты Закон «аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета БССР аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі». На наступны дзень, 26 жніўня, Вярхоўны Савет БССР прыняў Закон «Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці БССР».

19 верасня 1991 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў рашэнне аб змене назвы «Беларуская ССР» на «Рэспубліка Беларусь». 18 кастрычніка 1991 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў Закон «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь». Прававая прыналежнасць асобы да дзяржавы – грамадзянства –стала неад'емнай часткай дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі.

**II. З Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (***у рэдакцыі 15.03.2022 г.***)**

Артыкул 1. Рэспубліка Беларусь – унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава. Рэспубліка Беларусь валодае вяршэнствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі, самастойна ажыццяўляе ўнутраную і знешнюю палітыку. Рэспубліка Беларусь абараняе сваю незалежнасць і тэрытарыяльную цэласнасць, канстытуцыйны лад, забяспечвае законнасць і правапарадак.

Артыкул 3. Адзінай крыніцай дзяржаўнай улады і носьбітам суверэнітэту ў Рэспубліцы Беларусь з’яўляецца народ. Народ ажыццяўляе сваю ўладу непасрэдна, праз прадстаўнічыя і іншыя органы ў формах і межах, вызначаных Канстытуцыяй. <…>

Артыкул 6. Дзяржаўная ўлада ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца на аснове падзелу яе на заканадаўчую, выканаўчую і судовую.

Артыкул 79. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь з’яўляецца Кіраўніком дзяржавы, гарантам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна.<…>

Артыкул $89^{1}$. Усебеларускі народны сход – найвышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя Рэспублікі Беларусь, які вызначае стратэгічныя напрамкі развіцця грамадства і дзяржавы, забяспечвае непахіснасць канстытуцыйнага ладу, пераемнасць пакаленняў і грамадзянскую згоду.

Артыкул 90. Парламент – Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь з’яўляецца прадстаўнічым і заканадаўчым органам Рэспублікі Беларусь. Парламент складаецца з дзвюх палат – Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі.

Артыкул 106. Выканаўчую ўладу ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляе Урад – Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь – цэнтральны орган дзяржаўнага кіравання. <…>

Артыкул 109. Судовая ўлада ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца судамі. Сістэма судоў будуецца на прынцыпах тэрытарыяльнасці і спецыялізацыі.<…>

**III. Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь**

Муз. Н. Сакалоўскага, сл. М.Клімковіча, У. Карызны

Мы, беларусы – мірныя людзі,
Сэрцам адданыя роднай зямлі,
Шчыра сябруем, сілы гартуем
Мы ў працавітай, вольнай сям’і.
Слаўся, зямлі нашай светлае імя,
Слаўся, народаў братэрскі саюз!
Наша любімая маці-Радзіма,
Вечна жыві і квітней, Беларусь!
Разам з братамі мужна вякамі
Мы баранілі родны парог,
У бітвах за волю, бітвах за долю
Свой здабывалі сцяг перамог!
Слаўся, зямлі нашай светлае імя,
Слаўся, народаў братэрскі саюз!
Наша любімая маці-Радзіма,
Вечна жыві і квітней, Беларусь!
Дружба народаў – сіла народаў –
Наш запаветны, сонечны шлях.
Горда ж узвіся ў ясныя высі,
Сцяг пераможны – радасці сцяг!
Слаўся, зямлі нашай светлае імя,
Слаўся, народаў братэрскі саюз!
Наша любімая маці-Радзіма,
Вечна жыві і квітней, Беларусь!